СА СВЯТАМ ВЯЛІКАЙ ПЕРАМОГІ!

ПЕРАМОГА САВЕЦКАГА САЮЗА У ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЕ ПЕРАКАНАЎЧА ДАКАЗАЛА ЖЫЦЦЯЗДОЛЬНАСЦЬ І НЕСАКРУШАЛЬНАСЦЬ ПЕРШАЙ У СВЕЦЕ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ДЗЯРЖАВЫ. ЯНА З'ЯВІЛАСЯ ПЕРАМОГАЙ НАРОДЖАНАГА КАСТРЫЧНІКАМ НОВАГА ГРАМАДСКАГА І ДЗЯРЖАЎНАГА ЛАДУ, САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ЭКАНОМІКІ, ІДЭАЛОГІІ МАРКСІЗМУ-ЛЕНІНІЗМУ, МАРАЛЬНА-ПАЛІТЫЧНАГА АДЗІНСТВА САВЕЦКАГА ГРАМАДСТВА, НЕПАРУШНАЙ ДРУЖБЫ НАРОДАЎ СССР...

З Пастановы ЦК КПСС «Аб 30-годдзі Перамогі савецкага народа у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гадоў».

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 17 (1091) ● Чацвер, 8 мая 1975 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

МАЛЮНАК В. РОШЧЫНА.

Вясна і Перамога.

Яны заўсёды цяпер стаяць побач, гэтыя радасныя і неўміручыя словы. Вясновы і чысты прасцяг блакіту над намі сёння. Гэтае мірнае неба 30 год назад заваявалі савецкія салдаты, увесь наш мужны народ-змагар, народ-пераможца.

Няма сёння ў жывых многіх гераяў, але яны з намі штодзень. Яны ў велічных нашых справах і здзяйсненнях, у працоўных подзвігах.

Не шагаюць у святочных калонах многія былыя студэнты і супрацоўнікі універсітэта, якія ў гады вайны мужна ішлі насустрач смерці, каб здабыць Перамогу. Але ніхто з нас ніколі не закрэсліць у сваёй памяці іх імёны. Мы памятаем баявыя заслугі і тых выкладчыкаў і супрацоўнікаў нашай ВНУ, што і сёння слаўна працуюць на карысць грамадству, з павагай і захапленнем глядзім на ветэранаў вайны і ў гэтыя радасныя дні прыносім ім вясновыя кветкі.

Слава вам, адстаяўшым вясну чалавецтва і нашу вясну!

Віншуем са святам!

ПОДЗВІГУ НЯЗГАСНАЕ СВЯТЛО

ПРАЙШЛО трыццаць год з дня Вялікай Перамогі. У жорсткіх баях з нямецка - фашысцкай арміяй наш народ адстаяў сваю Савецкую Радзіму, заваёвы Вялікай Кастрычніцкай сацыялістычнай рэвалюцыі. У гіганцкіх бітвах на франтах Вялікай Айчыннай вайны вырашаўся лес не толькі Краіны Саветаў, але і усяго чалавецтва, вырашалася будучыня усяго свету.

Перамога Савецкага Саюза — перамога савецкага грамадскага і дзяржаўнага ладу, сацыялістычнай эканомікі, ідэалогіі марксізму-ленінізму, маральна-палітычнага адзінства савецкага грамадства, брацкай дружбы народаў сацыялістычнай Радзімы. «Гістарычная перамога савецкага народа, перамогшага фашызм — падкрэсліў Л. І. Брэжнеў, — гэта перш за усё пераконваючае сведчанне магутнай жыццёвай сілы нашага сацыялістычнага ладу».

Гітлераўцы сканцэнтравалі ля заходніх граніц нашай краіны велізарную армію, узброеную сучаснай баявой тэхнікай і, вераломна парушыўшы дагавор аб ненападзе, пачалі вайну супраць Савецкага Саюза. Працяжнік пераўзыходзіў савецкія войскі па колькасці у 1,8 раза, па сярэдніх і цяжкіх танках — у 1,5 раза, па баявых самалётах новых тыпаў—у 3,2 раза, па гарматах і мінамётах — у 1,25 раза. Над Краінай Саветаў навісла смяртэльная небяспека.

Камуністычная партыя накіравала галоўныя намаганні на тое, каб спыніць рух ворага ў глыб краіны і дабіцца пералому у ходзе узброенай барацьбы. ЦК ВКП(б) і Савецкі ўрад сканцэнтравалі сваю увагу перш за усё на умацаванні Савецкіх Узброеных Сіл, на кіраўніцтве іх баявой дзейнасцю. У краіне разгарнулася нябачаная па сваіх маштабах мабілізацыйная работа. Толькі за першыя шэсць месяцаў вайны было сфармірачана 286 новых стралковых дывізій, 159 стралковых і 76 танкавых брыгад. У дні цяжкіх выпрабаванняў шырокі размах прыняло фарміраванне знішчальных батальёнаў і часцей народнага апалчэння. У 1941 годзе было створана каля 60 дывізій народнага апалчэння, 290 асобных палкоў і рад спецыяльных часцей. Агульная колькасць народнага апалчэння склала 2 млн. байцоў.

У канцы чэрвеня 1941 года ЦК ВКП(б) прыняў рашэнне аб мабілізацыі камуністаў і камсамольцаў на фронт.

Камуністы знаходзіліся на самых адказных участках барацьбы з ворагам. Каля 2 млн. іх аддалі свае жыццё у імя Перамогі. Але партыя мацнела і гартавалася ў барацьбе з ворагам. З лета 1941 года да ліпеня 1945 года кандыдатамі у члены партыі было прынята каля 5,1 млн., а ў члены партыі каля 3,3 млн. чалавек.

З першых дзён вайны Камуністычная партыя і Савецкі ўрад накіравалі гіганцкія намаганні на перабудову народнай гаспадаркі на ваенны лад.

Дзякуючы перавагам сацыялістычнага ладу, велізарнай арганізатарскай рабоце партыі, мужнасці і самаадданасці савецкага народа, наша краіна да сярэдзіны 1942 года поўнасцю закончыла перабудову народнай гаспадаркі: прамысловасць пачала пастаўляць фронту ва ўсё узрастаючай колькасці ваенную тэхніку, боепрыпасы і абсталяванне, ствараючы матэрыяльныя прадпасылкі нашай перамогі.

Сур'ёзным стратэгічным фактарам у барацьбе з ворагам з'явіўся партызанскі рух. Ужо к канцу 1941 года у тыле нямецка - фашысцкіх войскаў дзейнічалі 3500 партызанскіх атрадаў і груп.

Тры гады палала полымя небывалай па сваіх маштабах і характару усенароднай партызанскай вайны на часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі. Арганізатарам і натхняльнікам барацьбы беларускага народа з'явілася Камуністычная партыя Беларусі.

Ператварэнне краіны ў адзіны баявы лагер, высокае усведамленне асабовым саставам Савецкіх Узброеных Сіл свайго воінскага абавязку давала магчымасць Чырвонай Арміі аказваць усё больш рашучае супрацьпаленне гітлераўскім полчышчам. На подступах к Ленінграду, Магілеву, Смаленску, Кіеву, Адэсе і Севастопалю Савецкая Армія нанесла гітлераўскаму плану «бліцкрыга» першы сур'ёзны ўдар, а затым зімой 1941—1942 гадоў разграміла адборныя злучэнні вермахта на подступах к Маскве, канчаткова сарваўшы фашысцкі план маланкавай вайны.

Праяўляючы стойкасць і мужнасць, Чырвоная Армія абяскровіла варожыя полчышчы у грандыёзнейшай бітве ў гісторыі чалавецтва — Сталінградскай і 19 лістапада 1942 года перайшла ў рашучае контрнаступленне. Пачаўся карэнны пералом у ходзе вайны. Разгром гітлераўцаў на Курскай дузе паставіў фашысцкую Германію перад катастрофай.

Нарошчваючы тэмпы наступлення, савецкія войскі у 1944 годзе здзейснілі нябачаныя па свайму размаху аперацыі: Корсунь - Шаўчэнкаўскую, Львоўска-Сандамірскую, Яска-Кішынёўскую і іншыя.

У 1944 годзе Чырвоная Армія вызвалила ад захопнікаў усю савецкую тэрыторыю і аднавіла дзяржаўную граніцу СССР на усім яе працягу ад Баранцава да Чорнага мора. Ваенныя дзеянні былі перанесены за межы Савецкага Саюза. Чырвоная Армія, працягваючы ажыццяўляць сваю вялікую вызваленчую місію, прыступіла да вызвалення гітлераўцаў з заняволеных фашызмам краін Еўропы.

У студзені 1945 года Чырвоная Армія пачала свае заключныя аперацыі па разгрому гітлераўскага вермахта, якія разгарнуліся адначасова на усім 1220-кіламетровым фронце, ад Балтыйскага мора да Карпат. Буйнейшай аперацыяй Савецкіх Узброеных Сіл на заключным этапе вайны была бітва за Берлін, якая пачалася 16 красавіка 1945 года. Зламаўшы супрацьпаленне гітлераўцаў, савецкія воіны ў ноч на 1 мая 1945 года узняліЧырвоны Сцяг Перамогі над павергнутай сталіцай фашысцкага рэйха.

Гады Вялікай Айчыннай вайны з'явіліся перыядам масавага гераізму савецкіх людзей, здзяйсняўшых бяспрыкладныя подзвігі і на фронце, і у тыле.

П. САВАЧКІН,
І. ЛІТВІНОЎСКІ.

Ветэраны другой сусветнай. Кажуць, што начамі гэтым паважаным людзям з сівымі скронямі сняцца франтавыя сцежкі, баі, загінуўшыя таварышы... А яшчэ ім, пэўна, сняцца чырвоныя цюльпаны Перамогі, якімі шчодра усцілалі дарогу сваіх вызваліцеляў народы Еўропы вясной памятнага 1945-га...

Прыміце і сёння, слаўныя сыны народа, наша шчырае захапленне і святую павагу сэрца.

Фота М. Нечыпарэнкі.



ТВАЕ АБАРОНЦЫ, РАДЗІМА

Л. Л. КАРОТКАЯ,
былая падпольшчыца, партызанка, цяпер—дацэнт кафедры рускай класічнай літаратуры філфака.

Аўтобус, які ідзе на Хатынь, заўсёды спыняецца каля Астрашыцкага Гарадка, і экскурсавод расказвае аб тым, як у гады Вялікай Айчыннай вайны тут дзейнічала падпольная арганізацыя настаўнікаў і школьнікаў.

Душой арганізацыі была Ларыса Каротка. Толькі два гады пасля заканчэння Мінскага педінстытута паспела папрацаваць яна ў роднай школе, а потым там пасяліліся гітлераўцы, запаліўшыя у першы ж дзень касцёр з падручнікаў.

— Ніхто тады не думаў аб геройстве. Барацьба з фашыстамі стала для нас абавязкам, надзённай справай, тым, чым жылі мы, — Ларыса Лявонцьеўна задумваецца. Пра сябе яна амаль не гаворыць. Затое з захапленнем расказвае аб тым, як сярод белага дня падпольшчыкам удалося звезці ад фашыстаў два вазы зброі, як узарвалі лесазавод, абяскшкодзілі здрадніка Герасевіча... А небяспека і смерць хадзілі побач.

— Вы цяпер успрымаеце гэта інакш, перш за усё бачыце рамантыку змагання. А мы слова «мужнасць» разумелі сэрцамі,—яна расказвае, як загінуў самы юны член арганізацыі шасцікласнік Коля Бароўскі. На шыю хлопчыка павесілі шыльду «я бандыт», дротам скруцілі рукі. А ён высока ўзняў галаву, і над знямелай вуліцай гарадка разнеслася: «Я партызан! Я забіваў фашысцкіх сабак».

Калі дзейнасць у падполлі стала немагчымай, Ларыса пайшла у партызаны. Была разведчыцай, кулямётчыцай. У атрадзе яе называлі Чайнай. Легенды хадзілі аб гэтай бясстрашнай дзяўчыне, а яна марыла аб школе...

Пасля вызвалення Беларусі Каротка зноў вярнулася да школьных спраў. Побач з баявымі узнагародамі заблішчаў медаль «За доблесную працу ў Вялікую Айчынную вайну».

Звыш ста вучняў недалічылася школа. «Давайце напішам пра іх кнігу», — прапанавала Ларыса Лявонцьеўна. Так у студзені 1945 года нарадзіўся рукапіс аб барацьбе школьнікаў і настаўнікаў з акупантамі, які лёг у аснову аповесці В. Сіманавай «Мы будзем жыць».

...Самай дарагой узнагародай Ларысе Лявонцьеўна лічыць медаль «За адвагу». Чаму?

— Вельмі канкрэтная, вельмі верная назва. Адвага... Тады яна была галоўнай у характары кожнага, толькі яна і вера у перамогу дапамагалі жыць і змагацца.

Ніколі ў жыцці не пажадаю вам, маладым, зведаць вайну. Але вы павінны не забываць пра яе дзеля жыцця...

Н. ІГНАЦЕНКА.

В. І. СЦЯПАНАЎ,
былы лектар Палітупраўлення 1-га Беларускага фронту, цяпер — загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў.

1944 год... Ворат вытнаны амаль з усёй тэрыторыі нашай краіны. Перад савецкімі воінамі стаяла новая складаная задача: выкананне вызваленчай місіі у акупіраваных фашысцкімі захопнікамі заходнееўрапейскіх краінах. Патрэбна было растлумачыць, паказаць усяму свету, што савецкія войскі не заваёўваюць, а нясуць мір і вызваленне ад фашызму. Велізарную ролю у гэтым адыграла работа палітрукоў, агітатараў.

Васіль Іванавіч Сцяпанаў быў лектарам у 1-й Гвардзейскай танкавай арміі генерала Катукова. Разам з таварышамі ён распаўсюджваў адозвы, лістоўкі, агітлісткі ад імя Ваеннага савета. Пранікнёныя радкі гаварыли пра тое, аб чым думаў кожны салдат: пра боль за разбураныя гарады і вескі, пра радасць перамогі.

Больш за усё запомніўся В. І. Сцяпанаву люты 1944-га. Іх танкавая армія авалодвала першымі нямецкімі гарадамі, населенымі пунктамі. Многае бачыў на франтавых дарогах вайны Васіль Іванавіч, але зноў быў паражаны мужнасцю, смеласцю савецкіх танкістаў. У сваіх выступленнях перад байцамі - вызвалцелямі ён праслаўляў армію, тлумачыў, яким павінен быць савецкі салдат у час вызвалцельнага шэсця па Еўропе.

А потым была Перамога, жаданая, хвалюючая. І радасна было усведамляць, што ў ёй ёсць і часцінка тваёй нялёгкай працы.

Л. КАЧКО.

М. Я. ЗАЙЦАЎ,
Герой Савецкага Саюза, былы лётчык штурмавога авіяпалка 4-га Украінскага фронту, цяпер — выкладчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў.

На долю Мікалая Якаўлевіча Зайцава прыйшлося чатырнаццаць месяцаў вайны. У гэты сціслы тэрмін «уклалася» 185 баявых вылетаў, незлічоная колькасць знішчаных варожых гармат, перапраў, танкаў, тэхнікі; вызваленне у складзе дзейнічаючай арміі Польшчы, Чэхаславакіі, Венгрыі. У выніку — тры ордэны Чырвонага Сцяга, ордэн Чырвонай Зоркі, ордэн Айчыннай вайны I ступені, чэхаславацкі медаль «За храбрасць», ганаровае званне Герой Савецкага Саюза, яшчэ шмат баявых узнагарод.

Не, гэта не кароткі тэрмін — чатырнаццаць месяцаў. У часы суровага выпрабавання кожны дзень вайны стаў годам...

...Узлёт! Пасля баёў пад Вінніцай у сакавіку 1944 года акружана варожая групіроўка. Коля Зайцаў, нядаўна скончыўшы трэцюю Чналаускую ваенна - авіяцыйную школу пілотаў, робіць свой першы баявы вылет. У вушах яшчэ гучаць словы загаду: «Наносіць удары з паветра, наносіць...» Так ён ушчыльную сутыкнуўся з вайной.

...Узлёт! Курс на Івана-Франкоўск. Якое выдатнае надвор'е выдалася ў пачатку мая 1944 года. І раптам неба разарвалася на мноства навалкаў—зенітны агонь фашыстаў. Кароткае проціборства з ворагам—і звяно штурмавікоў вырвалася з вогненнага кола. Набліжаецца фашысцкі аэрадром. Савецкія лётчыкі засталі гітлераўцаў знянацку. Уніз паляцеу смертаносны груз. Больш за 20 самалётаў знішчылі у той дзень штурмавікі. А калі Мікалай ляцеў назад, ён зрабіў заход на чыгуначную станцыю, занятую ворагам, і скінуў бомбы, што засталіся. Цяпер— хутчэй даганяць сяброў.

...Узлёт! Пауднёвая Сілезія, 1 мая 1945 года—звычайны дзень. Намеснік камандзіра эскадрыллі штурмавікоў Зайцаў, як ніколі, адчуў надыход канца вайны. Сёння яны ляцяць бамбіць пераправу праз Одэр пад Крэйцнордам. Вось і рака. Зверху бачна, як замітусіліся фашысты, грымнулі зеніткі. У жорсткі бой за праправу ўступілі фашысцкія знішчальнікі. Невялікая памылка — і агонь з неба або з паветра кіне цябе ў небыццё. Ну, хто кага?..

Вечарам Мікалай пісаў у рапарце: «Падавілі зенітную артылерыю праціўніка, сарвалі пераправу і збілі 4 нямецкія знішчальнікі...».

Адзін з тых збітых самалётаў быў яго, «асабісты».

...Узлёт! Вось і адно з апошніх баявых заданняў. Ніякай урачыстасці, палёт самы звычайны. Пара вяртацца. Але што гэта? У невялікім лясу, як на далоні, бачна скапленне людзей і тэхнікі. Імгненна Мікалай усё зразумеў: перад ім — рухомы штаб варожай групіроукі. А баявыя снарады, на жаль, скончыліся. Ён заспяшаўся дадому, потым зноў падняўся у паветра. Лясок знайшоў хутка. Атака была імклівай і удалай...

Чатырнаццаць месяцаў вайны... Гэтыя дні маглі быць іншымі, светлымі і радаснымі днямі мірнага жыцця. І Мікалай Якаўлевіч мог, як марылася ў дзяцінстве, асвойваць новыя трасы у Арктыцы або на Усходзе.

Але Радзіма паклікала на дапамогу, і ён стаў яе абаронцам і жаданым вызваліцелем.

С. ШЫДЛОЎСКАЯ.

Д. С. УМРЭЙКА,
былы партызан атрада імя Будзённага брыгады імя Фрунзе, цяпер —намеснік дырэктара НДІ ПФП.

Світанак яшчэ толькі займаўся, а вёска ужо жыла сваім размераным жыццём. То тут, то там чулася мычанне кароў, якіх пастух гнаў на пашу, лязгат вёдраў. Хлапчук, што гасціў у бабулі у вёсцы, набегаўшыся за дзень з вясковымі дзецьмі, спаў моцным сном, калі мірную цішыню раніцы парушыла страшная вестка: вайна! Што та вайна? Драўляныя пісталеты, шаблі, «чырвоныя-белыя»? Але чаму бабуля выцірае слёзы?

Гэта была сапраўдная вайна, з яе суровымі законамі. У першы ж дзень пайшоў на фронт бацька, і калі вясной 1942 года ў лясах паблізу вёскі Лавы Капыльскага раёна, дзе засталася сям'я Умрэйкі, сталі групіравацца партызаны, хлопчык з маці увайшлі у склад партызанскага атрада імя Будзённага.

Васьмігадовы Дзіма стаў паунапраўным членам атрада, і не толькі членам, але і адважным партызанам. Хіба магло прыйсці фашыстам у галаву, што хлапчук, які вандруе па вёсках, — сувязны, што ён выконвае заданне і што, вярнуўшыся у атрад, ён раскажа камандзіру аб размяшчэнні фашыстаў, аб іх узбраенні.

Дзіма не толькі здабываў звесткі, але і, рызыкуючы кожны раз папасціся на вочы гітлераўцам, здабывау для атрада зброю, боепрыпасы. Ён ужо разумеу, што такое вайна, ён уласнымі вачыма бачыу, як у жорсткім баі, вызваляючы вёску Лавы, гінулі партызаны, і сэрца маленькага байца поунілася нянавісцю да ворага. Здавалася б, што складанага было у рабоце хлопчыка? І усё ж часта іменна з яго дапамогай партызаны без промаху білі фашыстаў, раскрывалі планы і задумы ворага.

За смеласць і мужнасць дзевяцігадовы партызан Дзіма Умрэйка быў узнагароджаны медалём «Партызану Вялікай Айчыннай вайны». **І. САВЕТКІНА.**

В. С. ДАЛГАРУКАЎ,
былы камандзір зенітнай батарэі, партызан. Разам з часцямі Савецкай Арміі вызваляў Беларусь і Літву, цяпер — начальнік вучэбнага аддзела універсітэта.

Валерый Сцяпанавіч Далгарукаў сустрэў вайну камандзірам зенітнай батарэі, якая ў складзе 10-й арміі пад камандаваннем генерал-лейтэнанта Болдзіна знаходзілася пад Беластокам.

У 4 гадзіны раніцы раздаўся аглушальны вой сірэны, на гэты раз абвясціўшай не аб чарговай вучэбнай трывозе, а аб пачатку вайны.

Падбегшы да зенітак, байцы адкрылі агонь па варожых самалётах. У гэтай першай бітве прымаў удзел і баявы разлік Далгарукава. А потым ішлі бясконцыя баі, даводзілася адбіваць атакі фашыстаў па некалькі разоў на дзень. Аднак сілы былі няроуныя. І наша армія вымушана была адступаць.

Прарваўшыся праз вогненнае кальцо фашыстаў, Валерый Сцяпанавіч разам з таварышамі па зброі ўступіу у партызанскі атрад, які дзейнічау на тэрыторыі Беларусі. Так са жніуня 1941 года ён стаў партызанам.

Потым Валерый Сцяпанавіч ваяваў у Бранскіх лясах, спачатку камандзірам атрада, а потым начальнікам штаба брыгады «Смерць нямецкім акупантам». Восенню 1942 года за удзел у чыгуначнай дыверсіі Далгарукаў быу узнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі.

У ліпені 1942 года адным з першых у Савецкім Саюзе ён атрымау медаль «Партызану Вялікай Айчыннай вайны» I ступені за выдатнае правядзенне аперацыі на чыгунцы Масква—Кіеў. Гэта дарога мела важнае стратэгічнае значэнне, таму што выкарыстоувалася фашыстамі для перакідкі войск, боепрыпасау і рознай ваеннай тэхнікі у раён Курскай Дугі.

З верасня 1943 года спачатку у складзе Цэнтральнага, а потым і 3-га Беларускага франтоў вызваляў беларускую зямлю, Літву. Дайшоу да Кенігсберга. За смеласць і мужнасць, праяўленыя у баях за Усходнюю Прусію, Валерый Сцяпанавіч узнагароджаны ордэнам Чырвонага Сцяга.

А. КАЗАКОВА.

М. М. ДУДЗІЧ,
былы ваенны шафёр, цяпер — вадзіцель аутобуса ва універсітэце, пераможца у сацыялістычным спаборніцтве працаўнікоў АГЧ за 1974 год.

Страшная вестка пра вераломны напад фашысцкай Германіі на нашу Радзіму застала шафёра Міхаіла Міхайлавіча Дудзіча ў Брэсце, дзе ён са сваім начальнікам быу у камандзіроуцы. Калі вярнууся у Мінск, дома ужо нікога не застау.

Суседзі расказали, што жонка з месячным сынам у час налёту варожай авіяцыі спусцілася у бомбасховішча і не вярнулася. Адпомсціць за смерць сям'і цяпер Міхаіл Міхайлавіч лічыу сваім абавязкам.

Першыя месяцы вайны ён правёу у загарджальным атрадзе, у складзе якога абараняу Магілёу, Віцебск, Гомель.

Пад Калінінам фармаравалася адна са стралковых дывізій. Аднойчы у аутароту прыйшоу малады лейтэнант, ён шукау земляка, мінчаніна. Кароткай тады была сустрэча былога аспіранта БДУ М. М. Драко і шафёра М. М. Дудзіча, але доугай стала дружба двух франтавых таварышау.

Дацэнт біяфака Міхаіл Міхайлавіч Драко расказвае:

— Шлях нашай дывізіі складае многія тысячы кіламетрау — ад Калінінскіх лясоу да горада Печы у Венгрыі. Але Міхаіл Дудзіч на сваім ЗІСе праехау у некалькі разоу больш. За усю вайну ён змяніу толькі дзве машыны, і апошнюю здау у Львове з выдатнай адзнакай.

— Аднойчы, — расказвае М. М. Драко, — гэта было у Польшчы, у Сувальскай вобласці, быу аддадзены загад аб перадыслакацыі хлебапякарні. Нічога вакол не гаварыла аб тым, што раён Сейны захоплены немцамі, і Дудзіч праскочыу у іх размяшчэнне на тры кіламетры. Фашысты абстралялі машыну. Дудзіч і маёр Самылоўскі паспелі схавацца, адпаўзці у лес. Толькі раніцай яны трапілі у бяспечную зону.

Гэта толькі адзін эпізод баявога жыцця М. М. Дудзіча. Кожную мінуту небяспека падпільноувала яго і з неба і з зямлі, але ён не думаў пра гэта. Клопат пра людзей, адказнасць перад баявымі таварышамі ні на секунду не пакідалі Міхаіла Міхайлавіча. З гэтым ён прайшоу праз усю вайну.

Баявыя медалі, многа падзяк сведчаць пра тое, што баявы шлях сержанта Дудзіча быў нялёгкім, і прайшоу ён яго з гонарам.

А. ПЕРХАРОВІЧ.

У ГДР ёсць таварыства «Уранія», работай якога кіруе СЕПГ. Прапаганда ідэй сацыялізму, марксізму-ленінізму, перадавых ведау сярод народа — асноўная задача членау гэтага таварыства. Паміж таварыствам «Веды» СССР і таварыствам «Уранія» ГДР існуюць цесныя сяброускія кантакты.

Напярэдадні вялікага свята—30-годдзя Перамогі над гітлераускім фашызмам—я быу запрошаны выступіць з лекцыямі перад прапагандыстамі «Ураніі». Усе сустрэчы з працоунымі ГДР, членамі таварыства «Уранія» праходзілі выключна цёпла.

Кіраунікі таварыства «Уранія» прасілі мяне перадаць савецкім людзям віншаванні з 30-годдзем Перамогі над гітлераускім фашызмам і пажаданні поспехау у працы на карысць усеагульнага міру і шчасця. А старшыня раённага камітэта таварыства у г. Ратэноу (акруга Патсдам) Эвелін ХЕЗЕ перадала для публікацыі свой нарыс, у якім ажываюць успаміны пра савецкіх воінау, што прынеслі нямецкаму народу вызваленне ад фашызму, мірнае і спакойнае жыццё.

Р. ВАДЭЙКА,
дацэнт кафедры педагогікі і псіхалогіі.

МОЙ ПЕРШЫ ДЗЕНЬ МІРУ

Па-веснавому ярка свяціла сонца, пахла свежаўскапанай зямлёй, і прамыя градкі на садовых участках сведчылі не толькі аб нацыянальнай нямецкай акуратнасці, але і аб імкненні жыхароу Берліна папоуніць скупыя ваенныя паікі гароднінай.

Жудасна выліся сірэны. Але гэта не быў прывычны сігнал паветранай трывогі, гэта гучаў спецыяльны так званы «сігнал аб набліжэнні ворага». І як толькі раздаваўся страшны вой сірэны, маці хапалі дзяцей, самыя неабходныя рэчы і спяшаліся ў бліжэйшыя бомбасховішчы.

Поузалі розныя чуткі. Некаторыя настойліва паутаралі: «Заходнія улады аб'ядналіся з Гітлерам супраць рускіх»— і радаваліся гэтаму. Іншыя ціхенька выражалі сваю незадаволенасць. Гаварыць уголас пра гэта было небяспечна: на дрэвах раскачваліся павешаныя «здраднікі народа». Недабіты драпежнік —фашызм, ужо гінучы, пазверску распрауляўся з тымі, хто асмеліуся выступіць супраць яго.

Большасць маўчала: людзі не хацелі ніякіх саюзаў, яны хацелі толькі канца вайны, хацелі выбрацца з бункераў, хацелі, каб іх дзеці маглі спакойна спаць начамі, каб іх мужы і сыны жывымі прыйшлі з вайны.

«Лепш голад, чым вайна» — была самая распаусюджаная ў той час думка.

Раптам у бункеры паявіўся «залаты фазан» у поўным абмундзіраванні (так называлі ў народзе ортсгрупенфюрэраў нацыянал-сацыялістычнай фашысцкай партыі). Ён сказаў выразную прамову аб «даверы фюрэру», «вытрымцы», «помсце народа», «канчатковай перамозе» і паспешліва пайшоу з тым, каб праз дзве гадзіны, забыўшы пра свае гучныя словы, захапіўшы пажыткі, бегчы на захад.

Хваляванне нарастала. Падлеткі, карыстаючыся агульнай нервознасцю, адцягваючай увагу бацькоў, выскользвалі з бункера і вярталіся з весткамі аб страляніне на вуліцах, аб уцякаючых фашысцкіх салдатах...» І, нарэшце, вестка: «Рускія тут!!!».

Я ніколі не забуду, што пачалося ў гэтую мінуту ў бункеры. Многія плакалі, маліліся, звалі да сябе дзяцей — калі б чалавечае хваляванне валодала магчымасцю дэтанацыі, у тыя секунды тоўстыя сцены бункера разляцеліся б на кавалкі.

Некалькі мужчын, не страціўшых канчаткова розуму, узялі прыгатаваны зараней белы сцяг і выйшлі наверх. У бункеры наступіла магільная цішыня... І вось пачуліся крокі. У наступнае імгненне паявілася двое маладых савецкіх салдат. Яны былі зусім не такія, якімі іх малявала фашысцкая прапаганда. Нічога жахлівага, кроважэрнага, тупога ў іх абліччы не было. Стомленыя, запыленыя твары, адкрыты погляд... Некалькі секунд мы баязліва і недаверліва глядзелі на іх. Потым адзін салдат ссунуў на патыліцу сваю шапку і сказау на ломанай нямецкай: «Ну! Вайна капут! Гітлер капут! Алле, давай нах хаус!» Усё было зразумела і вельмі незразумела: «Як гэта рускія салдаты прапануюць ісці дадому, да свайго ачага? Ці магчыма гэта? Ці не пачнуць яны страляць у спіну?». Ніхто не кранууся з месца. Тады салдат паутарыу больш энергічна: «Давай! Давай! Дадомуі» — і недвухсэнсоўна паказаў на выхад.

Нясмела, нерашуча людзі сталі браць сваіх дзяцей, рэчы і выходзіць на вуліцу. Мы ішлі з цемры бункера да сонца і святла, ішлі ў суправаджэнні Савецкіх Салдат у наш першы дзень Міру.

Пераклала з нямецкай Е. П. БЕЙДЗІНА.

XXX

СТАРОНКІ СЛАВЫ БАЯВОЙ

МІНСК — ГОРАД-ГЕРОЙ



Раздзел «Старонкі славы баявой» вядзе в. а. дацэнта кафедры гісторыі СССР гістарычнага факультэта Л. А. Міхайлоускі.

(Заканчэнне. Пачатак у №№ 32, 35 за 1974 г. і у №№ 3, 5, 9, 13, 15 за 1975 г.).

У чэрвені-жніўні 1944 года Савецкая Армія нанесла нямецка - фашысцкім войскам сакрушальны ўдар на тэрыторыі Беларусі.

Чырвоная Армія пачала рыхтавацца да гэтай грандыёзнай аперацыі яшчэ з вясны 1944 года, калі яе войскі ачысцілі частку тэрыторыі Беларусі на ўсходзе. Лінія фронту на беларускім участку мела выгляд гіганцкага выступу, які выдаваўся вяршыняй далёка на усход. Агульная яе працягласць складала 1100 кіламетраў,

Імкнучыся любой цаной утрымаць Беларускі выступ, гітлераўскае камандаванне стварыла тут глыбока эшаланіраваную абарону і сканцэнтравала сваю буйнейшую групу арміи.

У нанясенні удару па ворагу прымалі ўдзел войскі 3-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерала Чарняхоўскага, войскі 1-га Беларускага фронту пад камандаваннем маршала Ракасоўскага, войскі 2-га Беларускага фронту пад камандаваннем генерала Захарава, войскі 1-га Прыбалтыйскага фронту пад камандаваннем генерала Баграмяна. Каардынацыю дзеяння гэтых чатырох франтоў ажыццяўлялі маршалы Савецкага Саюза Жукаў і Васілеўскі.

Акрамя гэтага, да аперацыі прыцягваліся злучэнні і атрады партызан, Дняпроўская флатылія пад камандаваннем капітана I рангу Грыгор'ева, авіяцыя далёкага дзеяння, аператыўныя аб'яднанні войск ПВО краіны.

У канцы мая 1944 года савецкія войскі прарвалі трывалую абарону ворага на Віцебскім, Аршанскім, Магілёўскім і Бабруйскім напрамках. Акружыўшы і знішчыўшы буйныя групіроўкі праціўніка ў раёнах Віцебска і Бабруйска, часці Савецкай Арміі хутка рухаліся наперад. У выніку умела праведзенай баявой аперацыі 30 варожых дывізій усходней горада Мінска трапілі у акружэнне і былі разбіты.

Велізарную ролю ў разгроме фашысцкай групы армій «Цэнтр» і вызваленні БССР ад гітлераўскіх захопнікаў адыграла шматтысячная армія беларускіх партызан. «Партызанская вайна ў Беларусі,—пісала «Правда» ў перадавым артыкуле 16 жніўня 1944 г.,—падрыхтавала спрыяльныя умовы для паспяховага наступлення Чырвонай Арміі на ўсёй тэрыторыі рэспублікі».

Народныя мсціўцы накіроувалі усе свае намаганні на аказанне максімальнай дапамогі наступаушай Чырвонай Арміі. Асабліва актыўнымі былі дзеянні партызан на дарогах, па якіх адступалі войскі праціўніка. Народныя мсціўцы блакіравалі многія ўчасткі шасэйных магістралей і большасць грунтавых дарог, нападалі на буйныя варожыя часці і калоны, не давалі ім магчымасці арганізавана адыходзіць і займаць абаронныя рубяжы у глыбіні, зрывалі перагрупіроуку сіл ворага і падвоз яго рэзерваў, парушалі сувязь і кіраванне войскамі.

У час ліквідацыі акружаных фашысцкіх войск пад Мінскам узнікла неабходнасць узмацніць абарону беларускай сталіцы. Па указанню ЦК КП(б)Б у горадзе і яго наваколлях было сканцэнтравана да 30 партызанскіх брыгад, якія правялі больш за 15 буйных аперацый, знішчыушы звыш 5 тысяч і ўзяушы у палон больш дзвюх тысяч гітлераўцаў.

3 ліпеня 1944 года войскі 3-га Беларускага фронту штурмам авалодалі сталіцай Беларусі Мінскам. У дзень вызвалення Мінска 20 тысяч партызан занялі пазіцыі вакол горада і вялі бесперапынныя баі з рэшткамі варожых дывізій, якія спрабавалі прарвацца з акружэння усходней Мінска. З 2 па 5 ліпеня мінскія партызаны захапілі ў палон больш за 6 тысяч салдат і афіцэраў праціўніка.

3 ліпеня танкавы корпус Бурдзейнага ўварваўся у Мінск. Камандзіру корпуса, герою вызвалення Мінска А. С. Бурдзейнаму было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза, а затым Мінскі гарсавет аднаму з першых прысвоіу яму званне «Ганаровы грамадзянін горада Мінска».

Танк, які першым уварваўся у Мінск, цяпер як вечны помнік героям-вызваліцелям устаноўлены на пастаменце каля Дома афіцэраў.

Дапамога партызан, падпольшчыкаў, усяго насельніцтва рэспублікі Чырвонай Арміі ў час яе наступлення у Беларусі высока ацэнена савецкім ваенным камандаваннем. У водгуках і віншаваннях у адрас ЦК КП(б)Б, урада БССР і беларускага народа камандаванне франтоу, вызваліушых Беларусь, адзначала выдатную ролю партызан у разгроме ворага і выгнанні яго за межы Беларускай ССР.

3 ліпеня Масква салютавала воінам, што вызвалілі Мінск. Звыш 50 злучэнняу і часцей 1-га і 3-га Беларускіх франтоу, якія вызначыліся у баях за сталіцу Савецкай Беларусі, атрымалі ганаровыя назвы «Мінскіх».

16 ліпеня 1944 года у разбураным і спаленым ворагамі Мінску адбыўся урачысты парад і мітынг партызанскіх сіл рэспублікі як трыумф вызвалення і перамогі над ворагам. На трыбунах стаялі кіраунікі партыі і урада рэспублікі, відныя военачальнікі, часці якіх удзельнічалі у вызваленні Мінска і Мінскай вобласці.

Дзень вызвалення Мінска ўвайшоў у гісторыю беларускага народа як дзень вызвалення усёй Беларускай ССР ад нямецка-фашысцкіх захопнікау. Газета «Правда» у перадавым артыкуле пісала: «Вызваленне Мінска, знамянуючае хуткае вызваленне Беларусі, — гэта вялікае светлае свята для усіх народаў нашай краіны».

КАМСАМОАЬСКІ САКРАТАР

Мінск — горад-герой...

Гэта высокае і пачэснае званне прысвоена сталіцы нашай рэспублікі за выдатныя заслугі перад Радзімай, за мужнасць і гераізм, праяуленыя працоунымі горада у барацьбе супраць гітлераускіх акупантау, за выдатную ролю у разгортванні партызанскага руху у Беларусі.

Арганізатарамі і кіраўнікамі самаадданага подзвігу мінчан былі камуністы.

Партыйнае падполле у Мінску узнікла і арганізацыйна аформілася з першых жа дзён акупацыі горада нямецка-фашысцкімі войскамі. Баявымі, надзейнымі памочнікамі камуністау былі камсамольцы-падпольшчыкі, і сярод іх — Георгій Фалевіч, студэнт IV курса хімічнага факультэта Беларускага дзяржаунага універсітэта.

...Высокі, стройны, светлавалосы юнак. Студэнты звалі яго Жоржам або Жорай. Сціплы, тактоуны, вытрыманы, ён быу добрым і чулым сябрам.

Перагортваем старонкі універсітэцкай шматтыражкі за даваенныя гады. 25 лістапада 1939 года газета пісала: «Студэнт III курса хімфака тав. Фалевіч здаў нормы на восем абаронных значкоу. Сваю актыуную работу у абаронных гуртках ён умела спалучае з паспяховай вучобай і грамадскай работай. З'яуляючыся сакратаром камсамольскага бюро факультэта, тав. Фалевіч многа і настойліва працуе у галіне наладжвання камсамольскай работы».

Ва усіх камсамольскіх справах Георгій Фалевіч заусёды паказваў асабісты прыклад. У лютым 1941 года камсамольцы, спартсмены універсітэта, правялі лыжны прабег Мінск—Баранавічы. Адным з арганізатараў і удзельнікаў гэтага прабегу быу сакратар камсамольскага бюро хімічнага факультэта. Мінскае возера называецца Камсамольскім таму, што яго будавалі пераважна камсамольцы. І на будаўніцтве возера (урачыстае адкрыццё якога было прызначана на 22 чэрвеня 1941 года) разам з усімі камсамольцамі універсітэта па-ударнаму працаваў Георгій Фалевіч.

...Так сталася, што выйсці з захопленага гітлераўцамі Мінска Георгій Фалевіч не змог: усе дарогі былі ужо пад кантролем нямецка-фашысцкіх войск.

У разбураным, спустошаным горадзе ён неузабаве сустрэу Уладзіміра Амельянюка, свайго дауняга таварыша, разам з якім раней працаваў у Плешчаніцах.

Уладзімір Амельянюк узначальваў агітацыйна-прапагандысцкую работу партыйна - камсамольскага падполля і прапанаваў свайму таварышу дапамагаць падпольшчыкам у іх барацьбе супраць акупантау.

Па заданню Амельянюка восенню 1941 года Фалевіч арганізаваў падпольную групу, базай якой стала аптэка па Савецкай вуліцы (супраць Дома урада).

Каб забяспечыць паспяховую дзейнасць падпольшчыкаў, трэба было стварыць надзейныя канспіратыуныя кватэры. Для гэтай мэты аптэка была асабліва зручнай. Не выклікаючы падазрэння, туды прыходзілі на яукі і Уладзімір Амельянюк, і легендарны Жан (Іван Кабушкін), і іншыя падпольшчыкі. У аптэцы захоуваліся не толькі медыкаменты, але і зброя, боепрыпасы, радыёпрыёмнік, шрыфты, падпольная літаратура.

Памяшканне аптэкі было зручным месцам для нарад падпольшчыкаў. Справа у тым, што у 50 метрах ад аптэкі, у будынку інстытута народнай гаспадаркі (на тым месцы, дзе зараз галоуны корпус універсітэта) размяшчалася фашысцкая «служба бяспекі» (СД). Гітлераўцы і уявіць не маглі, што побач з іх логавам, у пакоі загадчыка аптэкі збіраюцца кіраўнікі мінскага партыйнага падполля.

Група, якую ўзначальваў Георгій Фалевіч, мела цесныя сувязі з партызанскімі атрадамі, што дзейнічалі у Дзяржынскім і Лагойскім раёнах. Члены падпольнай групы многа разоў перапраулялі туды людзей, зброю, боепрыпасы, медыкаменты. Напрыклад, у маі 1942 года у партызанскі атрад імя Сталіна (Дзяржынскі раён) было перапраулена каля 50 чалавек.

З дапамогай засланых у падполле правакатараў гітлераўцам у сакавіку 1942 года удалося ажыццявіць масавыя арышты савецкіх патрыётаў. 7 мая 1942 года фашысцкія каты павесілі 28 падпольшчыкаў, у тым ліку сакратара гаркома Ісая Казінца, членаў гаркома — Георгія Сямёнава, Сцяпана Зайца. 251 падпольшчыка яны расстралялі.

26 мая 1942 года была арыштавана і падпольная група, якую узначальваў Георгій Фалевіч.

— У СД падпольшчыкаў жорстка катавалі, асабліва Жоржа, — успамінае Ніна Анісімауна Драздоуская (Ярмоленка), удзельніца падпольнай групы і сябар Георгія Фалевіча. Гітлераўцы вадзілі Жоржа па гораду, спадзеючыся, што яго хто-небудзь пазнае, і такім чынам выявяцца астатнія падпольшчыкі.

Нягледзячы на жудасныя катаванні, Жорж нікога не выдаў. Адмауляць вядомыя гітлераўцам факты яму не было сэнсу, і таму усю адказнасць ён узяў на сябе.

Улетку 1942 года Жорж захварэу тыфам. У жудасных турэмных умовах, знясілены катаваннямі і хваробай, ён на стужках, адарваных ад кашулі, пісаў таварышам, што не губляе бадзёрасці.

15 верасня 1942 года Георгія Фалевіча расстралялі фашысты.

А у непакораным Мінску на месца загінуушых падпольшчыкау уставалі дзесяткі новых змагароу. Партыйна - камсамольскае падполле пашырала сваю дзейнасць, узмацняла удары па ворагу, узнімала мінчан на пераможную барацьбу супраць гітлераускіх акупантау...

Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 10 мая 1965 года Георгій Фалевіч пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені.

На здымку, упершыню змешчаным ва універсітэцкай газеце 35 гадоу назад і перадрукаваным для гэтага артыкула, вы бачыце Георгія Фалевіча — студэнта нашага універсітэта, важака камсамольцау хімічнага факультэта, аднаго з першых мінскіх падпольшчыкау.

Л. КАРАТКЕВІЧ.



Вайна застала Паўла Канстанцінавіча Дзесюкевіча студэнтам гістарычнага факультэта нашага універсітэта. Павел з групай студэнтаў паспрабаваў выйсці з Мінска, але быў захоплены фашыстамі і накіраваны разам з калонай затрыманых мірных жыхароў у Слуцк, у лагер для ваеннапалонных. Хутка Паулу з некалькімі таварышамі ўдалося ўцячы.

Ён вярнуўся на радзіму ў вёску Магільна Уздзенскага раёна Мінскай вобласці і разам з таварышамі пачаў весці актыўную работу сярод насельніцтва па арганізацыі супрацiўлення акупантам. Потым Павел Дзесюкевіч стаў памочнікам камісара партызанскага атрада, які дзейнічаў у Дзяржынскім раёне. У гэты ж час ён — сакратар па прапагандзе Дзяржынскага падпольнага райкома камсамола.

У сакавіку 1944 года ў адным з баёў Павел быў цяжка паранены. Бачачы, што фашысты блізка і выратавацца ўжо немагчыма, ён апошнюю кулю пакінуў для сябе.

Пахавалі адважнага партызана на ўскрайку лесу, недалёка ад вёскі Заглінкі Уздзенскага раёна. Цяпер побач з ім, як сімвал, — манумент на брацкай магіле воінаў-вызваліцеляў.

Ю. ДРАГУН.

Нил ГІЛЕВІЧ

* * *

Часцей, часцей прыпамінай
Імёны паўшых смерцю храбрых
За родны край, наш мілы край,—
Каб над зямлёй, што млела у ранах,
Плыц гэты сіні-сіні ранак,
Цвіу гэты белы-белы май,—
Часцей, мой друг, прыпамінай!

Прыпамінай часцей, мой друг,
Імёны тых, што усё зрабілі,—
Вышэй усіх тваіх заслуг,
Што, як і ты, да слёз любілі
Міністы увосень на рабіне
І у ліпкіх смолках майскі луг,—
Не забывай пра іх, мой друг!..

ТЫ КАЖАШ, Я НЕ ВЕДАЮ ВАЙНЫ

Ты кажаш, я не ведаю вайны,
Што мне было тады гадоў замала.
Чаму ж яна мае забрала сны?
На усё жыццё наперад сны забрала?

Чаму ж амаль не кожнае начы
Я прачынаюся, скаваны жахам?
Хачу ад смерці лютай уцячы—
І стрымгалоу бягу аўсом няжатым,

Паўзу бульбянішчам па баразне,
Да хмызняку куляюся па пожні,

Але ратунку мне няма і ў сне—
У вочы стрэл грыміць у міг апошні...

Я ведаю: пазбыцца гэтых сноў
Не дапаможа мне ніхто на свеце.
Я буду трызніць імі зноў і зноў,
Яны — мае навек, да самай смерці.

Застаўшыся з маленства на вайне,
Я аднаго хачу, мая краіна:
Каб гэта скончылася усё на мне.
Каб гэта ўсё не стала доляй сына.

Рыгор СЕМАШКЕВІЧ

САЛДАТ



А потым ён заснуу. І доуга спау.
Ён так не спау яшчэ у жыцці ніколі.
Удзень атрад сапёраў міны рваў,
Што засталіся у быльняговым лолі.

А ён не чуу. Дрыжалі хаты, гай.
Спау чалавек спакойна, без трывогі.
І поуначчу таксама у гэты май
Вярнууся салавей з цяжкой дарогі.

Успырхнуу на галінку пад акном,
Запеу на усе лады—ну проста дзіва! —
Пра шаляваны, у цёмных грушах дом
І надвіллянскую сваю радзіму.

Нібы хацеу сказаць: «Ну, вось і я.
У любы край свой з песняю вярнууся.
Ты слухай, свеце, песню салуя».
Ён доуга пеу. І чалавек прачнууся.

Алег ЛОЙКА

МАГІЛА ЛЯ ВЁСКІ МЛЫНОК

Помнік адзінокі ў шчырым лесе,
Соснаў па-над ім, дубоу кражы...
Як праславіць гэтае Палессе,
Падкажы мне, лесе, падкажы!

З Каупаком ішоу ён ці у разведку,
З Ельска, Лельчыц ці адсюль—з Млынка, —
Як мне расхінуць дубровау сетку,
Як у твар запомніць юнака?..

Можа б, я пазнаў старую маці,
Бацьку згалубелага знайшоу,
Пасядзеу у адзінокай хаце,
Той, з якой на подзвіг сын пайшоу?

Мо б вярба ля весніц нагадала
Пра дзяучо з суседняга сяла,
Што іх сыну шаблю падавала,
Варанога коніка вяла?..

Не адну, я ведаю, магілу
Туліш ты да сэрца, край лясны.
Не, не забыцця слупок пахілы
Значыць, дзе вячыста спяць сыны.

Ды усё ж сэрцу падкажы, дай сілы
Песню хоць адну пра іх прапець,
Ды каб рэхам вечным тут хадзіла,
Бессмяротнай іх зрабіушы смерць!..

КАЛДЫЧЭВА

Брэх аўчарак хрыпасты.
Вышкі. Сонны патруль.
Лагер быў хітраю пасткай:
Ад Шчары — ні стрэлаў, ні куль.

Ды ці ж вінаватая багна,
Калі пад цяжарам начы
Вязні, што волі праглі,
Гінулі у ёй, крычучы?!

А ўдзень, хто па купінах дзівам
Да Шчары даносіў крок,
З прастрэленаю грудзінай
Падаў на Шчары выток.

Наплывалі хмары,
Гаслі зрэнкі надзей, —
Пачыналася Шчара
І з прабітых грудзей...

БАЛАДА ПРА ПОПЕЛ

Як прыцьмелае сонца,
Попелу шэрую шчопаць
Ля сэрца, у гімнасцёрцы
Нёс праз вайну усю хлопец.

І не кранулі міны
Ані у якім акопе:
Попел пісьмау дзяучыны
Быу не проста попел.

Літаратурны конкурс „ПЕРАМОЗЕ ПРЫСВЯЧАЕЦЦА" 30

Любоу ТАРАСЮК

СЯБРУ З ГДР

Ты даруй, хоць не наша у гэтым віна,
Што не у замкі багатыя сяроднявечча,—
Я цябе паказаць Беларусь прывяла
У няскораны Брэст,
У Хатынь знявечаную.

Не таму, што сама праз тую вярсту
З-за нядаунасці часу
Прыходзіць мушу я.
Гэта — абавязковы уступ
Да гісторыі нашай мужнай.
Час па-іншаму многае назаве,
Але з памяццю гэтаю — не размінецца...
Разумею, не проста табе сябе
Называць тут і у думках немцам...
Перайначыла лёс і твой ГДР.
А была да яе дарога смяртэльная...
Мы таварышамі прыходзім цяпер
Да сцяны у Бухенвальдзе Эрнста Тэльмана.

ДАКРАНАННЕ ДА ПОДЗВІГУ

НАРЫС

Рухавы вайсковы «газік», натужна равучы, караскаецца па чорным серпанціне вузкай шашы. Вакол — выпаленыя неміласэрдным пауднёвым сонцам бляклашэрыя схілы гор — ні дрэўца, ні куціка. Вышыня 800... 1.000. 1.200 метрау. Хоць і верасень, а духата такая, якая бывае часамі у нас у канцы ліпеня. Ад ціску, які хутка мяняецца, пачынае закладваць вушы— нібыта ў самалёце, што набірае вышыню...

Але вось і перавал... Мы ехалі ў славутую, адзіную на усю Савецкую Армію роту імя Героя Савецкага Саюза Васіля Клачкова, якая мае ажно дваццаць восем Герояў Савецкага Саюза! Іменна гэта рота стала калісьці сцяной ля раз'езда Дубасекава на шляху пяцідзесяці варожых танкаў. Васемнаццаць танкаў клачкоуцы падбілі, знішчылі дзесяткі фашыстаў. «Вялікая Расія, ды адступаць няма куды: за намі Масква», — словы гэтыя, знаёмыя сёння кожнаму школьніку, — гэта іменна яе словы, дакладней, яе палітрука алмаацінца В. Клачкова.

Камандзір роты, старшы лейтэнант В. Ніколенка прызначыў маім «гідам» Сяргея Градзінарава, камсамольскага важака роты. Сяргей «частуе» мяне ротнымі навінамі. У роце разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва у гонар 30-годдзя Вялікай Перамогі. Узятыя абавязацельствы — мець да свята у сваіх радах не менш 60 працэнтау выдатнікаў баявой і палітычнай падрыхтоукі, 90 працэнтау спартсменау-разраднікау, 85 працэнтаў значкістаў ваенна - спартыўнага комплексу — увасобяцца у жыццё.

Я прашу Сяргея правесці мяне у казарму. Хочацца не толькі пачуць пра усё, але і ўбачыць сваімі вачыма.

Бязлюдная ў гэты пасляабедзенны час — толькі дзяжурны, як заусёды, на сваім месцы — казарма сустракае прахалодай, чысцінёй. А вось і ўзорна афармлены — павучыцца б іншым — Ленінскі пакой. Адразу, ледзь толькі пераступіш парог, да цябе звяртаецца вялікі, прыгожа афармлены малюнак-плакат: «Воін! Ты служыш у роце імя Героя Савецкага Саюза Васіля Клачкова. Ганарыся гэтым, працягвай традыцыі бацькоў».

Традыцыі... З самага пачатку пабыўкі ў роце першае, на што ты звяртаеш увагу, — гэта ўшаноўванне, абераганне баявых традыцый роты, імкненне перайняць і памнажаць іх. Вось бюст Васіля Клачкова. Вось на сцяне яго фотапартрэт. Жалезны, як і усе астатнія, ложак палітрука знаходзіцца тут жа. Гэтак сама засланы, толькі, мабыць, яшчэ больш акуратна. Гаспадар не спіць на ім каторы ужо год, а ён усё роўна, кожную раніцу, пачынаючы з 23 верасня 1958 года — з часу залічэння В. Клачкова ў спісы часці навечна — засцілаецца і перазасцілаецца.

Яны, традыцыі, спрасаваны ў шматлікіх пісьмах былых воінаў роты, салдат Панфілаускай дывізіі, што засталіся у жывых. Альбом з гэтымі пісьмамі з гордасцю паказаў мне Сяргей. Ды і у самім слове «клачковец» няўжо не адчуваецца «радаслоўная» подзвігу?!

Прыгадваюцца словы, сказаныя у пачатку 1974 года міністрам абароны СССР Маршалам Савецкага Саюза А. Грэчка на Усеармейскай нарадзе сакратароў камсамольскіх арганізацый: «Думаецца, варта з усёй энергіяй падтрымаць высакародны пачын роты імя Героя Савецкага Саюза палітрука Васіля Клачкова «Традыцыі бацькоў прадоужым і памножым». У ім выяулена глыбокая павага армейскай і флоцкай моладзі да слауных здзяйсненняў старэйшых пакаленняў, яе імкненне вучыцца у іх майстэрству перамагаць, стойкасці і мужнасці, перайняць усе іх лепшыя якасці».



На нарадзе ў Маскве прысутнічаў і Сяргей Градзінараў. Не ведаю, пра што ён думаў тады, слухаючы гэтыя словы маршала, але мне рантам падумалася: няхай славіцца той, хто у патрэбны час кінуў патрэбны кліч. Але тройчы гонар і павага тым, хто ідзе на пачын, знаючы наперад, што выканаць высокія абавязацельствы ім будзе шмат цяжэй, чым многім іншым, якія прынялі выклік. На гэтым горным перавале, дзе і кіслароду меней, чым у нізіне, дзе летам гарачыня валіць з ног, зімой жа пранізлівы вецер прабірае да касцей, а снег, здараецца, поунасцю заносіць казарму, — на гэтым перавале загартоўваюцца сапраўдныя мужчыны, воіны, накшталт былых панфілаўцаў. Я ўжо не кажу пра амаль штодзённае нясенне караульнай службы, іншыя, чыста салдацкія абавязкі, відаць, больш складаныя, клопатныя, чым у іншых ротах. Хочацца нават думаць, што рота імя Васіля Клачкова была раскватаравана у гэтай суровай мясціне з-за асаблівай складанасці, незвычайнасці умоў жыцця і працы. Вялікаму караблю, як кажуць, — вялікае плаванне!

Мы прывыклі да таго, што на буйнейшых будоулях краіны, на прадпрыемствах, у калгасах і саугасах жывуць і працуюць дзеці розных савецкіх народаў. Гэтая нармальная, заканамерная для нас з'ява сёння нікога ўжо не здзіуляе. Але каб у невялікім калектыве, якім з'яуляецца рота, з'ядналіся ў адну непадзельную сям'ю прадстаўнікі дзевятнаццаці нацыянальнасцей — гэта, згадзіцеся, нават у арміі бывае не так часта. А сярод клачкоуцаў вы сустрэнеце рускага і казаха, украінца і кіргіза, чуваша і ненца, армяніна і узбека, грузіна і башкіра, латыша і эстонца, літоўца і кабардзінца...

...Як толькі Сяргей Градзінараў даведауся, што я з Мінска, тут жа радасна заіскрыліся яго вочы:

— А у нас ёсць і адзін беларус. Хочаце пазнаёміцца?

Прызнаюся, прыемна было чуць, што гамяльчанін Яуген Палтарацкі, былы выпускнік Гомельскага інстытута інжынерау чыгуначнага транспарту, — адзін з лепшых у роце. Успомнілі мы з ім славуты Гомельскі парк, навабудоўлі горада, залацістыя пляжы на берагах Сожа. Загаварылі пра ротныя справы.

— Дык у гэтым годзе ты, Яуген, звальняешся ў запас...

Вугалькі яго карых вачэй, што так ярка гарэлі дагэтуль, заслала пеляна тугі.

— Вы ведаеце, што дэмабілізацыя, дэмбель, як скарочана кажуць у нас, — наогул жаданая падзея для салдата. Але разам з тым і не хочацца расставацца з ротай, хлопцамі. Столькі добрага і рознага звязана ў мяне, цяпер ужо навечна, з арміяй, ротай імя Васіля Клачкова! Тут упершыню дакрануўся да святыні — подзвігу панфілаўцаў. Думаю, дома мне многія пазайздросцяць, што служыу іменна ў гэтай роце, у такой славутай дывізіі.

Дакрананне да подзвігу... Не толькі выпрабаванне на трываласць прыгатаваў лёс клачкоуцам, але і шчаслівы пачатак іх маладых біяграфій. Якая ўсё-такі ўдача, што на першых старонках іх жыццяпісаў будзе запісана: служба у роце імя Героя Савецкага Саюза Васіля Клачкова! Магчыма, зараз некаторыя нават не ўсведамляюць таго, што складзе іх будучы гонар. Гонар за ўсё чалавечае жыццё.

В. РАГОЙША.
Сярэднеазіяцкая вайсковая акруга — Мінск,

Верасень 1974 — сакавік 1975 гг.

«Белорусский университет»—орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2 000 экз. Аб'ём — 1 друк. ар. АТ 08658 Заказ № 789

Рэдактар А. А. ДЗЕРАШ.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоунага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.